2. Глушаков В.Е. Вызов времени: Беларусь на пороге тысячелетий. – Мн : Белбизнеспресс, 1999 – С. 77-141.
3. Бугрова И.И. Идентичность Беларуси: из опыта «понимающей» политологии.//VECTOR – 3/1997. – С. 2.
4. Марцуль Г.Ф., Сташкевіч М.С. Гісторыя Беларусі: Насельніцтва. Фарміраванне і вызначэнне этнічных і дзяржауна-адміністрацыйных межау. Беларускае замежжа. – Мн., 1997 – С. 51-55.
5. Глушаков В.Е. Указ. соч. – С. 129-131.
6. Люкевич В., Скакун Е. Современная белорусская молодёжь в системе изменяющихся ценностей. // Аналитический бюллетень Грамадская альтэрнатыва, - 1/1998 – С. 32-33.
7. Чернов В. Авторитарный режим в Беларуси: характер, запас прочности, варианты трансформации.// Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь Адкрытае грамадства, - 4/1998 – С. 5-8.

## ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ПРАЗ ЛЮБОЎ ДА ПРЫРОДЫ РОДНАГА КРАЮ.

Бунько Я.Н.
г.Брест , БрДУ

Спакон вякоў у беларускага народа існавалі і беражліва захоўваліся патрыятычныя пачуцці, якія ўвасаблялі гонар за сваю Радзіму і імкненне да яе абароны. Гэта знайшло адлюстраванне ў гераічным эпасе, а пазней у рукапісных і друкаваных кнігах. Так, у «Павучанні» Кірылы Тураўскага гаворыцца аб выхаванні любві і пашаны да роднай зямлі, а Францішак Скарына ў сваіх кнігах прапаведвае любоў да Радзімы, як натуральнае і моцнае пачуццё кожнага добрага чалавека.

Пачуццё патрыятызму ў народа абвастраецца пры пагрозе нацыянальнай бяспецы, у час ваенных дзеянняў і, наадварот, прыглушаецца у перыяды эканамічнай і палітычнай нестабільнасці, у час сацыяльнай неўпарадкаванасці грамадства. Такое становішча цяпер назіраецца у нашай дзяржаве. Сёння, як было адзначана ў часопісе «Народная асвета» (№6,1998), праблема патрыятычнага выхавання з'яўляецца «праблемай выключнай грамадзянскай значнасці, ад вырашэння якой у значнай ступені залежыць духоўнае здароўе нацыі і перспектыва яе развіцця».

Аднак, неабходна адзначыць, што праблема адраджэння патрыятызму застаецца адной з самых нявывучаных на сённяшні дзень. Таму сёння на Беларусі многія філосафы, сацыёлагі, гісторыкі, псіхолагі і педагогі актыўна уключыліся ў яе распрацоўку і распрацоўку структуры нацыянальнай свядо-

масці. Многія навукоўцы працуюць над вывучэннем характэрыстыкі узроставых этапаў яе фарміравання.

Вядома, што пачуццё патрыятызму з`яуляецца складаным унутраным утварэннем кожнай асобы, а гэта абумоўлівае шматлікасць тлумачэнняу гэтага паняцця. Мы лічым, што патрыятызм, перш за усё, - гэта любоў да Айчыны і жаданне змагацца за яе дабрабыт.

У педагагічнай навуцы і практыцы доўгі час існаваў вузкі падыход да фарміравання патрыятызму пераважна на гераічных падзеях вайны. Акрамя таго у якасці сродкаў патрыятычнага выхавання настаўнікі выкарыстоўвалі грамадска-карысную працу, музыку, літаратуру і турысцка-краязнаўчую дзейнасць школьнікаў. Кожны з іх сапраўды можа быць эфектыўным для канкрэтных умоў і абставін. Аднак, нельга не ацаніць выхаваўчы уплыў і патэнцыял роднай прыроды ў фарміраванні высокароднага пачуцця патрыятызму.

Вельмі многія вучоныя выказвалі і выказваюць думкі аб тым, што навакольная прырода з`яуляецца неацэнным і вельмі важным сродкам выхавання патрыятызму. Сярод іх неабходна назваць Я.А.Каменскага, А.Дзістэрвега, Ж..-Ж..Русо, К.Д.Ушынскага, М.В.Ламаносава, В.В.Сямёнава, Дз.Н.Кайгародава, В.А.Сухамлінскага і інш. Вялікі чэшскі педагог Я.А.Каменскі гаварыў аб уплыве мясцовага матэрыялу, у тым ліку і прыроды, на фарміраванне асобы чалавека. К.Д.Ушынскі, ужо рускі педагог, называў прыроду «вялікай выхавацельніцай» і скардзіўся, што яе «выхаваўчае значэнне так мала ацэнена у педагогіцы». А вялікі савецкі педагог В.А.Сухамлінскі падкрэсліваў, што «любоў да Радзімы пачынаецца з першага захаплення прыгажосцю, якую бачыць перад сабой дзіця». Таму ён у сваей практычнай працы у якасці настаўніка шырока выкарыстоўваў прыроду і першае знаёмства дзяцей са школай пачынаў са «Школы радасці», якую арганізоўваў непасрэдна на прыродзе, падбіраючы для гэтага цікавы і прыгожы куток наваколля. В.А.Сухамлінскі лічыў, што «нельга прабудзіць чуццё Радзімы без успрымання і перажывання прыгажосці навакольнага свету». На сённяшні дзень для многіх бясспрэчным стала прызнанне велізарнага выхаваўчага уздзеяння прыроды на чалавека. Зносіны з ёй- крыніца развіцця яго духоўных і фізічных сіл. Вялікія педагогі заклікалі не адасабляць жыццё і дзейнасць дзяцей ад прыроды, вучылі пазнаваць яе з розумам і мэтанакіравана, і адчуваць яе фарбы, гукі, формы, пахі, разнастайнасць. Такім чынам, спадчына педагогаў мінулага і дзейнасць сучасных, а таксама асабісты вопыт жыцця, дазваляюць сцвярджаць, што менавіта з пачуцця прыроды роднага краю пачынаецца пачуццё Радзімы.

Як сцвярджаюць псіхолагі, пачуццём прыроды, як і музычным слыхам, надзелены не кожны. Яго неабходна развіваць. Важна паказаць, што наша Радзіма непаўторная у сваей прыгажосці, што людзі непарыўна звязаны з прыродай, клапоцяцца пра яе, што яна - гэта наш гонар, наша багацце, духоўнае і фізічнае здароўе усяго народа. Нават далёкі ад палітыкі чалавек, пісьменнік-прыродавед Міхаіл Прышвін гаварыў, што прырода «для нас кладоўка сонца з вялікімі скарбамі жыцця... Ахоўваць прыроду - значыць ахоўваць Радзіму». Ён таксама бачыў, што ў гэтай формуле закладзены вялікія магчымасці для патрыятычнага выхавання, і лічыў, што прырода з`яўляецца яго дзейным сродкам.

Часта можна пачуць пытанне: «У якім узросце трэба пачынаць патрыятычнае выхаванне чалавека і яго нацыянальную свядомасць, каб яно было больш эфектыўным і плённым». Вядома з дзяцінства, чым раней, тым лепш. На нашу думку, праца ў гэтым напрамку павінна пачынацца мэтанакіравана ў дзіцячых садках і працягвацца ў пачатковай школе, і як ужо гаварылася, шляхам знаёмства, вывучэння і аховы навакольнага прыроднага асяроддзя. В.А.Сухамлінскі лічыў, што развіваць пачуццё прыроды неабходна з ранняга ўзросту, менавіта тады, калі «дзеці асабліва адчувальныя і да слова, і да вобраза, і да духоўнага свету другога чалавека«.

Неабходна адкрываць дзецям прыгажосць і багацце роднай прыроды і таго, што створана рукамі чалавека. Няхай дзіця глядзіць на шырокія палі, засеяныя жытам, на квітнеючы сад, на кучаравую бярозку ў марозным інеі, навучыцца ўдыхваць прыемны пах луга, спечанага хлеба, даведаецца пра кошт працы, навучыцца перажываць за гора сябра і радавацца яго поспехам - гэта і будзе першай прыступкай у фарміраванні шматузроўневага пачуцця патрыятызму. В.А.Сухамлінскі таксама падкрэсліваў, што, «дзіцячыя гады, той узрост, які мы лічым узростам бесклапотнай радасці, гульні, казкі, - гэта вытокі жыццёвага ідэалу. Менавіта ў гэты час закладваюцца карані грамадзянскасці. Ад таго, што адкрылася дзіцяці ў навакольным асяроддзі ў гады дзяцінства, што яго здзівіла, што усхвалявала і прымусіла плакаць - не ад асабістай крыўды, а ад клопату за лес іншых людзей, - ад гэтага залежыць, якім грамадзянінам будзе наш выхаванец.»

Радзіма пачынаецца для дзіцяці з куска хлеба, жытнёвай нівы, з лясной паляны і блакітнага неба, з казак і песень маці над яго калыскай. І яшчэ адно не менш важнае, аб чым пісаў В.А.Сухамлінскі. Ён падкрэсліваў, што менавіта дарослыя накіроўваюць увагу дзяцей. Менавіта дарослыя павінны «шырока расчыніць дзверы ў захапляючы свет навакольнай прыроды, і яны (дзеці) будуць прыслухоўвацца да журчання крынічкі, звону вясенняга капяжу, да песні жаваранка і, яе вынік, беражліва адносіцца да прыроды, любіць яе».

Сузіранне прыгажосці прыроды, пачуццё замілаванасці ею абуджае у душы дзіцяці самыя высокія памкненні. І як піша В.А.Сухамлінскі: »Радасць быцця і грамадзянскае пачуццё зліваюцца у адно цэлае». У такім выпадку дзіця ўжо ніколі не зможа заставацца раўнадушным у адносінах да сваей Бацькаушчыны, таму што пачуццё любві да Радзімы стала яго асабістым перажываннем, якое ўвайшло ў яго эмацыянальную сферу.

Трэба адзначыць, што для паспяховага выхавання грамадзян-патрыётаў сваей краіны, неабходна каб такімі былі дарослыя, якія займаюцца гэтым выхаваннем. Вядомы французскі асветнік Шарль Мантэскье падкрэсліваў, што «лепшы сродак прывіць дзецям любоу да Айчыны заключаецца ў тым, каб гэтая любоў была у бацькоу».

У выхаваўчым працэсе, у тым ліку і патрыятычным, павінны прымаць удзел сям я і школа у цесным узаемадзеянні. Выдзяляецца некалькі этапаў такога ўзаемадзеяння:

-пачатковы: вядучая роля належыць настаўніку, які праз розныя формы і метады уздзеяння на сям`ю актывізуе яе удзел у выхаванні;

-пераходны : настаўнік уключае бацькоу непасрэдна ў выхаваўчы працэс;

-аптымальны: настаўнік і бацькі з`яўляюцца партнёрамі ў выхаваўчым працэсе.

На прыканцы мы жадалі б зрабіць наступныя высновы:

1. Патрыятычнае выхаванне моладзі павінна пачынацца мэтанакіравана з дзяцінства, з таго часу, калі дзіця пачынае актыўна рэагаваць на навакольнае асяроддзе, на прыроду і не пазней першага класа пачатковай школы.
2. Патрыятычнае выхаванне на першым этапе перш за ўсё павінна ажыццяуляцца праз любоў да роднай прыроды.
3. Патрыятычнае выхаванне павінна ажыццяўляцца ў комплексе з экалагічным і эстэтычным выхаваннем.
4. Патрыятычнае выхаванне павінна быць цесна звязана з адраджэннем нацыянальнай свядомасці.
5. Мэтай патрыятычнага выхавання ад пачатку павінна быць не толькі прывіцце любві да роднай прыроды, да Радзімы у цэлым і адраджэнне нацыянальнай свядомасці, але і выхаванне у падрастаючага пакалення пачуцця гаспадара сваей зямлі, сваей Радзімы.
6. Для патрыятычнага выхавання павінны падбірацца і выкарыстоувацца такія формы і метады, вынікамі якіх будуць актыуныя дзеянні па ахове Радзімы і жаданне актыуна дзейнічаць па упарадкаванню асабістага ладу жыцця і жыцця кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.